# ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ НАВУЧЭНЦАЎ НА ЎРОКАХ РОДНАЙ МОВЫ

**В.У. Палаўко,**
выкладчык беларускай мовы і літаратуры
Пінскага дзяржаўнага аграрна-тэхнічнага каледжа
імя А.Я.Кляшчова

*Я не ганю землі чужыя,-*
*Хай іх сонца не абміне.*
*Толькі дзе б за морам ні жыў я,*
*Беларусь мая снілася мне.*
*Г.Бураўкін*

Сёння такія якасці, як грамадзянскасць, патрыятызм, праходзяць сур’ёзныя выпрабаванні. Патрыятызм з’яўляецца найважнейшай маральнай якасцю чалавека.

Беларускі асветнік Ф. Скарына гаварыў, што пачуццё патрыятызму дае любоў да Радзімы, нараджае імкненне абараняць яе. Патрыятызм уключае ў сябе паважлівыя адносіны да роднай мовы; замілаванне да тых мясцін, дзе чалавек нарадзіўся і вырас, павагу да гістарычнага мінулага сваёй краіны і атрыманых у спадчыну традыцый; гонар за сацыяльныя і культурныя дасягненні Радзімы.

У час педагагічнай дзейнасці выкладчык звяртае ўвагу на фарміраванні самых істотных якасцяў навучэнцаў – аб’ектыўнага адчування свайго месца ў прасторы і часе, месца ў грамадстве.

Дапамагчы навучэнцам асэнсаваць сутнасць грамадскіх суполак і вызначыць сваё месца ў кожнай з іх – адзін з галоўных абавязкаў навучальна-выхаваўчай установы, калі яна жадае называцца школай жыцця. Маладое пакаленне прыходзіць у грамадства, якое ўжо мае складаную сістэму іерархічных стасункаў і развіваецца на суладнай падпарадкаванасці.

Мэты патрыятызму і грамадзянскасці – палепшыць становішча ў краіне.

Святы абавязак − быць патрыётам.

Можна захапляцца маляўнічымі краявідамі, абараняць абшары, але не быць патрыётам. Ім робішся тады, калі адчуеш сваю прыналежнасць да мясцін, дзе нарадзіўся, і да той зямлі, на якой плённа выяўляюцца творчыя задаткі, калі зразумееш неабходнасць асабістай адказнасці за фізічны і духоўна-інтэлектуальны стан наваколля.

Узаемасувязь людзей і навакольнага асяродку разгортваецца не толькі на фізічным узроўні (ахова прыроды, абарона краіны), а і на духоўна-інтэлектуальным. Найбольш разгорнута яна перадаецца ў мове і праз мову. Таму ўсе народы, вялікія і малыя, пільна берагуць родную мову, каб не згубіць духоўную прастору, не знікнуць у безаблічнасці. Без роднай мовы няма і патрыятызму.

Мова – сутнасны элемент-складнік патрыятызму, яго духоўна-інтэлектуальная сарцавіна.

Мова – душа народа, векавая праца многіх пакаленняў, люстэрка духоўнага жыцця і творчасці грамадства, наш галоўны і неацэнны скарб.

На ўроках роднай мовы і літаратуры, у ходзе праектнай, літаратурнай і даследчай дзейнасці, пазакласных мерапрыемствах, на экскурсіях у мяне ёсць магчымасць дапоўніць, паглыбіць веды, уменні і навыкі навучэнцаў па прадмеце, навучыць самастойнай працы, паспрыяць паспяховай сацыялізацыі моладзі як унікальнага прадстаўніка грамадства, сярод прыярытэтаў якога – адданасць сваёй Радзіме, унікальнай культурна-гістарычнай спадчыне, непаўторнай мове і ахвярнае служэнне свайму народу.

На ўроку па тэме “Знакі прыпынку ў канструкцыях з чужой мовай” з мэтай для выхавання патрыятызму, як духоўнага складніка асобы грамадзяніна, павагі да гісторыі сваёй Радзімы, выкарыстаны тэксты патрыятычнай накіраванасці.

***Ключавыя словы:*** простая мова, чужая мова, канструкцыі з простай мовай.

***Мэты:***

*навучальная:*узнавіць і сістэматызаваць веды пра сказ у тэксце; замацаваць уменні вызначаць сінтаксічныя прыметы і асаблівасці пабудовы канструкцый з простай мовай; удасканальваць навыкі ўжывання знакаў прыпынку ў канструкцыях з простай мовай;

*развіццёвая:*развіць здольнасць захоўваць літаратурныя нормы ў вусным і пісьмовым маўленні; садзейнічаць развіццю лагічнага мыслення, вуснага маўлення, арфаграфічнай пільнасці;

*выхаваўчая:*ствараць умовы для выхавання патрыятызму, як духоўнага складніка асобы грамадзяніна, павагі да гісторыі сваёй Радзімы.

***Тып урока:*** камбінаваны

***Міжпрадметныя сувязі:***Беларуская літаратура, Гісторыя Беларусі

***Метадычнае забяспячэнне:*** падручнік, карткі, мастацкі твор А. Адамчыка "Хатынская аповесць", тэставыя заданні.

**Ход урока**

1. ***Арганізацыйны момант***

Які ты расклала агонь, вайна, —
жывое ўсё губячы скрозь,
Белай-бялюткай бяроза была —
І пачарнела ўся вось…
Такога агню не знала зямля,
стыхіі лютай такой.
Вёска гарыць сярод белага дня,
Горад гарыць за ракой.

*АнатольВярцінскі.*

Вялікая Айчынная вайна і страты ў ёй – балючая, незагойныя рана беларускага народа.Ні на адной самай падрабязнай геаграфічнай карце вы не знойдзеце сёння гэтай беларускай вёскі.

Хатынь – гэта сімвал вялікай трагедыі, той, што на вякі захоўваецца ў народнай памяці і ў сэрцах кожнага новага пакалення. Хатынь – гэта сімвал мужнасці і гераізму народа, яго няскоранасці перад чорнымі сіламі фашызму, перад нашэсцем чужынцаў. Гэта помнік усенароднай барацьбы, горкая гордасць народа.

***2. Актуалізацыя ведаў***

Прачытайце верш. Звярніце ўвагу на радкі, якія асабліва вас уразілі.Патлумачце правапіс арфаграм. Патлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў выдзеленым сказе.

Як бол**ь** несціханы,

Як жудасны напамін

М**е**мар**ыя**л у **Х**атыні.

Праз кожныя 5 хвілін

Б**’**юць 26 званоў,

***Стогнуць 26 камінoў-***

***26 спаленых у Хатыні хацін.***

Б’юць званы, будзячы зыбы**цц**ё,

Бо 2 мільёны беларусаў

Аддалі жыццё.

Б’юць званы…

Далёка **ў** свеце чуваць яны.

*Марцін Наг*

- Сапраўды, далёка ў свеце чуваць званы Хатыні. Верш, які вы толькі што пачулі, напісаў нарвежскі пісьменнік Марцін Наг. Гучыць слова “Хатынь” на розных мовах свету, каб ніхто і ніколі не забываў, што такое вайна, якое гора, які боль нясе яна людзям.

***3. Паведамленне тэмы і мэты ўрока***

- Працуючы з вершам, мы ўспомнілі пастаноўку знакаў прыпынку ў бяззлучнікавых сказах. Сёння на занятку замацуем уменні вызначаць сінтаксічныя прыметы і асаблівасці пабудовы канструкцый з простай мовай,

удасканалім навыкі ўжывання знакаў прыпынку ў канструкцыях з простай мовай.

Тэма урока: “Знакі прыпынку ў канструкцыях з чужой мовай”.

***4. Фарміраванне ўменняў, навыкаў, выкарыстанне ведаў на практыцы.***

Простая мова, г. зн. выказванне, мова іншай асобы, якое на пісьме перадаецца двума спосабамі:

Лінейна – у адзін радок.

Нелінейна – простая мова пачынаецца з абзаца. Такая простая мова пашырана ў творах мастацкай літаратуры.

Простая мова можа займаць любое месца ў адносінах да слоў аўтара, ад чаго і залежыць яе афармленне на пісьме.

Паглядзіце на табліцу і прыгадайце ўмовы пастаноўкі знакаў прыпынку ў канструкцыях з простай мовай:

| | Схема | Прыклады |
|---|---|---|
| 1 | А: “П?”<br><br>А: “П!”<br>А: “П…”<br><br><br>А: “П”. | Голас полем пракаціўся, у бары аддаўся: “*А дзе ж тая крынічанька, што голуб купаўся?*”<br>Я моцна крычу сонцу: *“Добры дзень!”*<br>Юрка агледзеўся наўкола і прыцішана стаў клікаць хлопцаў: *“Ідзіце, ідзіце, не бойцеся, тут жа нікога няма…”*<br>Просіць дачка: *“Раскажы мне казку”.* |
| 2 | “П”, - а.<br>“П?” - а.<br>“П!” - а.<br>“П…” - а. | *“Няма нікога дома”,* – катэгарычна адказаў хлопчык.<br>*“Ну як жа, кумка, маецца?”* – кума ў кумы пытаецца.<br>*“Здароў, Міхась!”* – і Язэп кінуўся абдымаць Міхася.<br>*“Колькі тут сілы, хараства, прыгажосці…”* – сказаў хлопец. |
| 3 | “П,-а.-п”. | “*За ляском,* - гаворыць старшыня,- *прыдатнае месца для будаўніцтва фермы*”. |
| 4 | “П,-а.-П…” | “*Зараз пойдзем*- сказаў Антон.- *Давай руку, уставай,* |

| | | |
|---|---|---|
| | <br>“П?-а.-П”.<br><br>“П!-а.-П”.<br><br>“П…-а,-П”. | *пагрэй ногі”.*<br>*“Не было яшчэ нашых?*- спытаўся сяржант.- *Відаць, яшчэ ў акопах ваююць…”*<br>*“Давай едзь!*- прыспешыў Брытвін.- *Мы чакаем. А тады дамовімся”.*<br>*“Загадка... Туман...*- задуменна прамовіў міліцыянер. Ён пільна паглядзеў на Ганну. -*Е адна здагадка, і вельмі простая. Што Дзяцел Васіль... сам... чакаў іх”.* |
| 5 | “П,-а:-П?”<br><br><br>“П?-а:-П”.<br><br><br>“П!-а:-П?” | *“Дзякуем за ўсё вам, шаноўная Лідзія Іванаўна,*- за ўсіх адказаў хлопец і тут жа дадаў: — *Мы да вас з просьбай. Ці не дазволіце нам пераначаваць у вас яшчэ адну нач?”*<br>*“Што самае галоўнае было ў маім жыцці?* - пытаецца ў сябе Васіль Сухамлінскі і дае вычарпальны адказ:- *Любоў да дзяцей”.*<br>*“Папаўся!* - адразу зразумеў Сяргей і тут жа насцеражыўся:- *А Клава? Што з ёю?”* |
| 6 | А: “П”,- а.<br><br>А: “П!”- а.<br><br>А: “П?”- а.<br><br>А: “П…?!”, - а. | Маці сказала: *“Збіраецца на дождж”,*- і пачала ўглядацца ў чорную хмару, якая насоўвалася з боку лесу.<br>Генерал выйшаў у завіруху і крыкнуў: *“Па конях!”*- хоць усе былі іменна на конях.<br>Алесь Іванавіч хацеў запытаць: *“Хутка пойдзем?”*- але прамаўчаў.<br>Непадалёк сталі збірацца натоўпам людзі: *“Дзе... якое наступленне?! Орша?!”* - крыкнуў хтосьці, бегучы паўз Васіля і Валю да шумлівага натоўпу. |
| 7 | “$П_1$..”-“$П_2$.”-“$П_1$.” | *“Ваяваць можаш? Шпіталь, здаецца, табе непатрэбны...” –* “Непатрэбны, таварыш гвардыі старшы лейтэнант.”– *“Вось і добра”.* |
| 8 | - $П_1$.<br>- $П_2$? | - А пра мянушку, брат, ты нікому не кажы.<br>- Пра якую мянушку? |

| | | |
|---|---|---|
| | - П1.<br>- П2.<br>- П1!... | - Ну, што я - Цудатворац.<br>- Зробіш даклад - не скажу.<br>- Э, Аляксей!.. *(Я. Брыль).* |
| 9 | А:<br>- П1?<br>- П2. | І вось праз гэтую тугу і праз коўдру, якой былі накрыты хлопцавы вочы, што пачалі нядаўна бачыць у цемры, раптам пачууўся голас дзядзькі Антося:<br>- Толя, ты спіш?<br>- Ды не, не сплю яшчэ, дзядзька Антось. |
| 10 | А.<br>- П! | Мірон Іванавіч падняўся.<br>- Ахову лагера ўзмацніць! |
| 11 | - П?-а.<br>- П, - а. | - *Ну, што з вамі?* - спытаўМаксім, пераступіўшы парог разведчыцкай зямлянкі.<br>- *Што? Нічога,* - адказаў стары. |
| 12 | - П?<br>- П! - а.- П. | - Хочаце? Пойдзем сёння гуляць?<br>- *Пойдзем, пойдзем!*- падхапіў настаўнік. -*Вы, можа, не паверыце, а ў мяне, чэснае слова, была гэта самая думка, толькі я не адважваўся сказаць вам.* |

*Вывад.* Такім чынам, для таго каб правільна паставіць знакі прыпынку ў канструкцыях з простай мовай неабходна вызначыць як яна перадаецца на пісьме: лінейна або нелінейна.

- Гэта адбылося 22 сакавіка 1943 года. Азвярэлыя фашысты ўварваліся ў вёску Хатынь і абкружылі яе. Жыхары вёскі нічога не ведалі аб тым, што раніцай за 6 км ад Хатыні партызаны абстралялі аўтакалону гітлераўцаў і ў выніку нападзення быў забіты нямецкі афіцэр. Але ні ў чым не павінным людзям фашысты ўжо вынеслі смяротны прысуд. Усё насельніцтва Хатыні ад малога да вялікага – старых, жанчын, дзяцей – выганялі з хат і гналі ў гумно. Прыкладамі аўтаматаў падымалі хворых, старых, не шкадавалі жанчын з маленькімі дзецьмі і немаўлятамі.

Калі ўсе жыхары вёскі былі ў гумне, фашысты запёрлі дзверы, аблажылі будыніну саломай, аблілі бензінам і падпалілі. Драўлянае гумно

імгненна загарэлася. У дыме задыхаліся і плакалі дзеці. Дарослыя спрабавалі ратаваць іх. Пад націскам дзесяткаў чалавечых цел не вытрымалі і ўпалі дзверы. У ахопленым агнём адзенні, апанаваныя жахам, людзі кінуліся бегчы, але тых, хто вырываўся з полымя, фашысты расстрэльвалі з аўтаматаў і кулямётаў. У агні зажыва згарэлі 149 жыхароў вёскі, з іх 75 дзяцей да 16-гадовага ўзросту.

Жывымі засталіся толькі двое дзяцей – сямігадовы Віктар Жалабковіч і дванаццацігадовы Антон Бараноўскі. Разам з іншымі з палаючага гумна выбегла і Ганна Жалабковіч. Яна моцна трымала за руку сямігадовага сына Віцю. Смяротна параненая жанчына, падаючы, прыкрыла сына сабою. Дзіця з прастрэленай рукой праляжала пад трупам маці да адыходу карнікаў з вёскі. Антон Бараноўскі быў паранены ў нагу разрыўной куляй. Гітлераўцы палічылі яго мёртвым.

***Практыкаванне 1.***Прачытайце ўспаміны Ісіфа Іосіфавіча Камінскага, жыхара в. Хатынь Лагойскага раёна Мінскай вобласці, сведка хатынскай трагедыі, 56 гадовага вясковага каваля з аповесці Алеся Адамовіча “Хатынская аповець”. Спішыце сказы з простай мовай, зрабіце іх схему.

“ І мяне павялі ў той хлеў... Дачка, і сын, і жонка -ужо там. І людзей столькі. *Я кажу дачцэ: “Чаму вы не адзеліся?”* - *“Дык сарвалі з нас адзежу,- кажа дачка.- З мяне і даху з плеч сарвалі, раздзелі нас...”* Ну, прыгоняць у хлеў і зачыняць, прыгоняць і зачыняць. Столькі людзей нагналі, што і не прадыхнуць ужо, руку не падымеш. Людзі крычаць, дзеці гэтыя; ведама, столькі людзей і страх гэтакі. Сена там было, салома, кармілі яшчэ, трымалі кароў. Зверху і падпалілі. Падпалілі зверху, гарыць страха, агонь на людзей сыплецца, сена, салома загарэліся, душацца гэтыя людзі, так сціснулі, што і дыхаць ужо няма як. Няма як дыхнуць. *Я сыну кажу: “Упірайся ў сцяну рукамі і нагамі, упірайся...”* А тут дзверы расчыніліся. Расчыніліся, а людзі не выходзяць. Што такое? Аж там страляюць, страляюць там, кажуць. Але крык такі, што стрэлу таго, што стуку таго і не чуваць. Ведама ж, гараць людзі, агонь на галовы, ды дзеці -такі крык, што... *Я сыну кажу: “Праз*

*галовы, праз галовы трэба!"* Падсадзіў яго. А сам па нізе, паўз ногі. А на мяне бітыя і наваліліся. Наваліліся на мяне бітыя тыя, і прадыхнуць нельга. Але паварушыў плячыма - тады я здаравейшы яшчэ быў,- стаў паўзці. Толькі да парога дапоўз, а страха і абвалілася, агонь на ўсіх... А сын выскачыў таксама, толькі голаў яму трохі абсмаліла, валасы абгарэлі. Адбег метраў пяць - яго і палажылі. На ім людзі пабітыя - з кулямёта ўсіх...

*"...Уставай, - кажу,- яны паехалі, паехалі ўжо!"* Стаў яго выцягваць, аж з яго і кішкі ўжо... Спытаў яшчэ толькі, ці мама жывая... Не дай бог нікому, хто на зямлі жыве, каб не бачылі і не чулі гора такога..."

***Практыкаванне 2.*** Спішыце тэкст, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку. Патлумачце правапіс выдзеленых арфаграм.

Звоняць званы **Х**атыні… Звоняць над спаленымі хатамі над л**ё**сам людзей што ведалі свабоду і **шч**асце. Звоня**ць** над бра**ц**кай магілай аднав**я**скоўцаў над магіламі дзяцей свет для якіх яшчэ не **ў**спрымаўся далей навакольнага лесу. Звоняць званы Хатыні і гучыць іх палымяны заклік Людзі, будзьце пільныя

Хатынь – гэта сімвал вялікай трагедыі той што на вякі захоўваецца ў народнай памяці і ў сэрцах кожнага новага пакалення. Хатынь – гэта сімвал мужнасці і гераізму народа, яго няскоранасці перад чорнымі сіламі фашызму, перад нашэсцем чужынцаў. Гэта помнік усенароднай барацьбы, горкая гордасць народа.

***Практыкаванне 3.***Прачытайце тэкст, вызначце яго асноўную думку. Спішыце выдзеленыя сказы. Складзіце схемы канструкцый з простай мовай.

На месцы спаленай разам з жыхарамі вёскі Хатынь быў адкрыты мемарыяльны комплекс.

Урачыстае адкрыццё мемарыяльнага комплекса "Хатынь" адбылося 5 ліпеня 1969 года. Мемарыял "Хатынь" уключаны ў дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны.

Мемарыяльны архітэктурна-скульптурны комплекс "Хатынь" паўтарае планіроўку былой вёскі і складаецца з асобных фрагментаў. У цэнтры

мемарыяла ўзвышаецца бронзавая скульптура Няскоранага чалавека – быццам ён ідзе насустрач вам з паміраючым хлопчыкам на руках. Вышыня скульптуры 6 метраў.

*(Няскораны чалавек – чалавек, які на сваіх плячах вынес усе цяжкасці вайны. Боль і гнеў, смутак і помста выражаны на яго твары. І здаецца нам, быццам яго вусны хочуць нам сказаць: "Бачыце я жывы, я не скарыўся фашыстам!")*

Справа ад скульптуры – сімвалічны дах калгаснага гумна, у якім гарэлі хатынцы. Дарожка з белага мармуру сімвалізуе апошні шлях жыхароў Хатыні.

Злева ад скульптуры ўвекавечана месца загубы жыхароў вёскі.

*Над брацкай магілай Вякок памяці са словамі звароту загінуўшых да жывых:*

*"Людзі добрыя, помніце:*

*мы любілі жыццё,і Радзіму нашу, і вас, дарагія.*

*Мы згарэлі жывымі ў агні.*

*Наша просьба да ўсіх:*

*няхай жалоба і смутак абернуцца ў мужнасць вашу і сілу,*

*каб змаглі вы ўсталяваць мір і спакой на зямлі.*

*Каб ад гэтага часу нідзе і ніколі ў віхуры пажараў жыццё не памірала!"*

Дарожка з жалезабетонных пліт вядзе да былой вясковай вуліцы. На месцы кожнай хаты ляжыць першы вянец зруба.

Унутры абеліск з мемарыяльнай плітой.На ёй імёны і прозвішчы зажыва спаленых людзей, указаны ўзрост дзяцей да 16 гадоў.

Абеліск увенчаны звонам. Званы Хатыні гучаць адначасова кожныя 30 хвілін. Звоняць яны і ў буру, і ў сонейка, і калі ідзе снег, і завывае мяцеліца. Звоняць раніцай і вечарам, днём і ноччу.

Перад кожнай з 26 спаленых хат адчыненыя весніцы – сімвал гасціннасці жыхароў вёскі.

На месцы чатырох былых калодзежаў – сімвалічныя калодзежы.

***Практыкаванне 4.***Прачытайце ўспаміны Якава Сяргеевіча Стрынатка з в. Шалаёўка Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці з аповесці Алеся Адамовіча “Хатынская аповець”. Што вы адчуваецце пасля прачытаннага урыўка? Спішыце сказы з простай мовай, расстаўляючы прапушчаныя знакі прыпынку, зрабіце іх схему.

“У сорак другім, летам гэта было, партызанаў тут не вельмі яшчэ чуваць было. У Борках паліцыя была. А тут немцы раптам акружылі Боркі. Каго на полі ці ў кустах сустрэнуць, не забіваюць, а гоняць перад сабой - у вёску. А я якраз ехаў у Боркі, ячменю абяцалі прадаць. Чэрці мяне пагналі якраз пад гэта! Хацеў назад каня завярнуць – не дазволілі. Не білі, што праўда то праўда, толькі паказалі, каб ехаў у Боркі. Я пагнаў каня, каб скарэй ад іх, заехаў у двор, там сястра ў мяне была. Яны таксама бачаць, што немцы з усіх бакоў, а чаму, што здарылася, не ведаюць. Дзед хлопцаў боркаўскіх лае за тое, што ноччу да дзевак бегаюць у суседнія вёскі: немцы, можа, падумалі, што да партызанаў. Мы з пляменнікам з хаты выйшлі, дровы сталі пілаваць: не так страшна, калі што-небудзь робіш. Сястра не вытрымала, хацела да суседкі забегчы, а немцы ўжо не пускаюць. “Нахаўз, матка!” Нікога на вуліцы не чапалі, не забівалі, што праўда, то праўда. Толькі –“нахаўз”, дамоў каб ішлі. Пляменніцу з сяброўкай, каторыя па вуліцы пайшлі, загналі ў чужую хату. Стаім каля вокан, глядзім, як немцы па ўсёй вёсцы і па агародах. А Боркі вялікія, некалькі пасёлкаў... Пляменнік гаворыць маці: “Ану іх, давай нам снедаць!” – “Паедуць, тады і сядзеце, і выпіць ёсць”, – кажа маці. А тут і застукала ў двары. Зайшоў з аўтаматам, адразу адштурхнуў сястру маю ад парога і адразу перасек яе. А я як адскочу ад стала, калі пачуў іх у двары, як сеў на кравать, так і сяджу - толькі цёмна-цёмна ў вачах... Пляменнік з-за стала падняўся - немец і яго! Паспеў я яшчэ ўбачыць, як з другой комнаты старога піхалі. Тут ужо і па мне разанулі - я адкінуўся на кравать. Калі адкрыў вочы зноў - дзед ужо мёртвы ляжыць каля парога, і нешта чаўкае - гэта свінні зайшлі і кроў гаспадароў хлабышчуць...»

*Сястра не вытрымала, хацела да суседкі забегчы, а немцы ўжо не пускаюць: “Нахаўз, матка!”Пляменнік гаворыць маці: “Ану іх, давай нам снедаць!”* - *“Паедуць, тады і сядзеце, і выпіць ёсць”,- кажа маці.*

- За тры гады акупацыі 186 беларускіх вёсак былі спалены гітлераўцамі разам з жыхарамі. 209 гарадоў і гарадскіх пасёлкаў, 9200 вёсак зруйнавалі фашысты ў Беларусі, 5925 з якіх знішчаны разам з усім ці часткай насельніцтва.Загінуў кожны чацвёрты жыхар Беларусі.

Столькі зведаўшы гора, нягод,
Столькі слёз, і крыві, і агню-
Ты, Радзіма, на тысячы год
Заслужыла сабе цішыню.

*Ніл Гілевіч*

***5. Замацаванне вывучанага матэрыялу***

Праверачны тэст

1. Адзначце, якой схеме адпавядае пастаноўка знакаў прыпынку ў сказе з простай мовай.

Алесь Іванавіч хацеў запытаць…Хутка пойдзем?... але прамаўчаў.

1) А: “П”,- а.

2) *А: “П?”- а.*

3) “П,-а,-п”.

4) А: “П?”

2. Адзначце, якой схеме адпавядае пастаноўка знакаў прыпынку ў сказе з простай мовай.

… Ты ж, брат, глядзі ў мяне… звярнуўся да Карагі Булякін…(І,і) не памыкайся ўцякай…

1) “П.-а.-п”.

*2) “П,-а.-П”.*

3) “П,-а:-П”.

4) “П?-а.-п”.

3. Адзначце сказы з няправільна аформленай простай мовай.

*1) “Давайце мы вам дапаможам перайсці” - прапанавалі дзеці бабульцы.*

2) Маці ледзь чутна сказала: “А хто ж табе, дачушка, апроч мяне дапаможа”.

3) - А хто там прыйшоў? - пачуўся голас з дальняга пакоя.

*4) “Паехалі хутчэй” крыкнуў бацька і злосна дадаў “Маглі б ужо даўно сабраць усё”.*

4. Адзначце сказы з няправільна аформленай простай мовай.

1) Марфа кажа малой: “Дай я цябе, дачушка, панясу”.

2) *Уладзімір ціха спытаў: - А ці праўда, што хутка чалавек паляціць у космас.*

3) *А што трэба для гэтага? не адступаў Валодзя.*

4) *“Пайшлі” сказаў хтосьці і буркнуў “Хопіць стаяць”.*

**6. Падвядзенне вынікаў. Рэфлексія**

- Сённяшні ўрок – сведчанне таго, што ў Беларусі ніколі не знікне памяць пра палеглых на палях вайны салдат, пра іх трагічны лес, пра тое, што любая вайна нясе страты, нішчыць маладосць і каханне, красу жыцця, чалавечае шчасце. Наша памяць павінна быць актыўнай. Тады яна не пакідае чалавека абыякавым, бяздзейным.

За мірны час пасля вайны змянілася беларуская зямля.

Што б вы хацелі пажадаць нашай Радзіме?

Што б вы хацелі пажадаць усім людзям?